Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Тры гады калоніі агульнага рэжыму: у Гомелі асудзілі Сяргея Яфімава

12.11.2020 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, сілавыя структуры



Скрыншот відэа Следчага Камітэту, TUT.BY

**КАРТКА ПРАЦЭСУ**

**Суд:** г.Гомеля

**Артыкул:** 364 Крымінальнага кодэксу (гвалт у дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі)

**Абвінавачаны:** Сяргей Яфімаў

**Пакаранне, запрошваемае дзяржабвінавачаннем:** тры гады калоніі агульнага рэжыму

**Пакаранне:** тры гады калоніі агульнага рэжыму

**Пацярпелыя:** два супрацоўнікі АМАП і іх камандзір

**У Гомелі за гвалт у дачыненні да міліцыянтаў (арт. 364 КК) на тры гады калоніі агульнага рэжыму асудзілі 29-гадовага гамельчука Сяргея Яфімава, паведамляе TUT. BY.**

Паводле звестак следства, У Гомелі ўвечары 9 жніўня ў раёне сквера Кірылы Тураўскага мужчына падбег да супрацоўніка АМАПа, распыліў пярцовы газ яму ў твар з газавага балончыка і ўдарыў яго ў галаву. Прычым перад гэтым, па словах праваахоўнікаў, супрацоўнік міліцыі ні словам, ні дзеяннямі не выяўляў намераў затрымаць мужчыну. На дапамогу міліцыянту падбеглі двое калег і спрабавалі затрымаць нападніка, той спрабаваў вырвацца, распыляў газ і нанёс аднаму з супрацоўнікаў *"не менш за дзевяць удараў у вобласць галавы і тулава"*. Доказам у судзе з'явіліся паказанні пацярпелых міліцыянтаў, а таксама відэа, знятае камерамі відэаназірання на плошчы Леніна ў Гомелі.

Як падчас следства, так і ў судзе Сяргей цалкам прызнаў віну. Распавёў, што нападаць на міліцыянтаў у той вечар не збіраўся, але спалохаўся, што пачнуцца затрыманні, расхваляваўся, стаў уцякаць, а калі наткнуўся на амапаўцаў, дастаў балончык і распыліў. Пацярпелыя ў справе — два супрацоўнікі АМАПу і іх камандзір. Адзін з пацярпелых ацаніў нанесеную маральную шкоду ў 700 рублёў, другі — у 800, трэці заяўляць грашовую кампенсацыю не стаў.


Пракурор прасіў прысудзіць Сяргея Яфімава да трох гадоў калоніі агульнага рэжыму — такі прысуд суд у выніку і вынес.


Перад абвяшчэннем прысуду абвінавачваны выступіў з апошнім словам.

> *— Я прызнаю віну, прызнаю, што зрабіў памылку. Мог жыць без зняволення, працаваць і займацца сям'ёй. Разумею, што здзейсніў злачынства і павінен за гэта адказаць, але прашу не пазбаўляць мяне волі.*


Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 921 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




## "Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

## Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

## "Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

## "КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"




ГАЛОЎНАЕ

## Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



## #ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

# Спіс палітычных вязняў

## АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Грамадзяніна Польшчы асудзілі ў Беларусі за "агентурную дзейнасць"

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў


МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

## Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ






## ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

## СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY